# «ВЯСЁЛКА», ЯКАЯ ДОРЫЦЬ РАДАСЦЬ

Фальклорны калектыў «Вясёлка» на педагагічным факультэце існуе пяць гадоў, і за гэты час ён ужо стаў папулярным і запатрабаваным. Цяжка падлічыць, колькі разоў дзяўчаты прымалі ўдзел у розных мерапрыемствах. Запрашаюць «Вясёлку» і на адкрыццё канферэнцый, і на розныя святы, канцэрты, фестывалі. Чакаюць самадзейных артыстаў у дзіцячых садках, школах, інтэрнатах.

Народныя песні, што выконвае «Вясёлка», гучаць па-новаму і западаюць у душу дзякуючы мастацкаму кіраўніку Юліяне Самсонаўне Сусед-Вілічынскай, якая робіць аранжыроўку. У рэпертуары калектыву пераважаюць беларускія народная песні – аўтэнтычны фальклор Віцебскага рэгіёна і абрадавыя сцэнарыі ў аўтарскай інтэрпрэтацыі кіраўніка. Усё гэта праводзіцца ў рамках сацыяльна-педагагічнага праекта «Народныя традыцыі вачамі моладзі XXI стагоддзя».

Нярэдка падчас выступленняў калектыў выкарыстоўвае батлейку, у тым ліку лялькі, што зрабілі студэнты мастацка-графічнага факультэта нашага ўніверсітэта.

Спадзяёмся, што з кожным годам рэпертуар «Вясёлкі» будзе толькі пашырацца і што сваімі выступленнямі яна будзе прыносіць асалоду не толькі студэнтам і выкладчыкам нашай ВНУ, але і жыхарам горада.

**С. АЛЁШЫНА.**



Фота з архіва педагагічнага факультэта.

**На здымку:** фальклорны калектыў «Вясёлка».